УДК 811.161.3

Цеплякова Альбіна Дзмітраўна
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)
albinka-t@yandex.ru

ІНШАМОЎНЫЯ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІЯ КРЫНІЦЫ КРЫЛАТЫХ СЛОЎ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ*

У артыкуле разглядаюцца іншамоўныя літаратурна-мастацкія крыніцы крылатых слоў у беларускай мове, даецца класіфікацыя літаратурна-мастацкіх крыніц паводле жанравых

* Даследаванне выканана ў межах задання НДР "Універсальнае і нацыянальнае ў фразеалагічнай і парэміялагічнай падсістэмах беларускай мовы (у еўрапейскім моўным кантэксце)» (ДР № 20161332) падпраграмы «Беларуская мова і літаратура» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў "Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства" на 2016–2020 гг.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

адрозненняў, падаецца ўзор лексікаграфічнага апісання крылатых выразаў і афрызмаў, якія паходзяць з англамоўных літаратурна-мастацкіх крыніц.

Ключавыя словы: сучасная беларуская мова, крылатыя словы, літаратурна-мастацкія крыніцы, лексікаграфія

The article considers the foreign literary and artistic sources of popular expressions in the Belarusian language, a classification of literary sources on genre differences, provide a sample of the lexicographical description of popular expressions and aphorism originated from English literary and artistic sources.

Keywords: Modern Belarusian, winged words, literary and artistic sources, lexicography

Крылатыя словы – гэта шырока вядомыя і масава ўжывальныя цытаты з розных тэкставых крыніц. Сувязі паміж крылатымі словамі і тэкстамі, адкуль яны паходзяць, захоўваюцца ў свядомасці носьбітаў мовы ў асацыятыўнай форме [6], але могуць з цягам часу знікаць, і тады крылатыя словы пераходзяць у разрад фразеалагізмаў [22] ці прыказак [13, с. 47–48]. Гэтаму садзейнічае яшчэ і тое, што многія крылатыя словы да таго, як трапілі ў пэўны тэкст, з якім пачало асацыявацца іх паходжанне, шырока ўжываліся ў маўленні як гатовыя слоўныя комплексы [5] ці афарыстычныя адзінкі [12], [34].

Крылатыя выразы і афарызмы ў беларускай мове, паводле прыналежнасці тэкставых крыніц свайго паходжання, размяжоўваюцца на ўласна моўныя, якія паходзяць з беларускіх крыніц [24], [33], і запазычаныя, якія паходзяць з іншамоўных крыніц [1], [2], [7], [14], [18], [25], [26], [30], [32], [35]. Асноўнымі крыніцамі крылатых слоў з'яўляюцца літаратурныя творы розных жанраў і выказванні вядомых асоб [20], [21], [23], а таксама фальклорныя тэксты [15]. Вызначэнне дакладных моўных і тэкставых крыніц крылатых адзінак на фоне еўрапейскіх моў з'яўляецца, як адзначыў Я.Я. Іваноў на XV Міжнародным з'ездзе славістаў [3], адной з актуальных праблем даследавання беларускай парэміялогіі і афарыстыкі ў агульнаеўрапейскім кантэксце [4].

Літаратурныя творы як крыніцы іншамоўных (запазычаных) крылатых слоў размяжоўваюцца на творы мастацкай літаратуры, біяграфічныя творы, эпісталярныя тэксты, публіцыстычныя творы, юрыдычныя тэксты, філасофскія творы, навуковыя, навукова-папулярныя і протанавуковыя творы, тэксты музычных твораў, ананімныя літаратурныя тэксты [14], [18], [19]. Літаратурна-мастацкія творы розных жанраў з'яўляюцца асноўнымі па колькасці крыніцамі іншамоўных крылатых слоў у беларускай мове [8], [9], [16], [17]. На падставе шэрагу папярэдне праведзеных намі даследаванняў [27], [28], [29], [31], можна вызначыць асноўныя разнавіднасці літаратурна мастацкіх крыніц у сучаснай беларускай мове.

Літаратурна-мастацкія творы розных відаў і жанраў як тэкставыя крыніцы запазычаных крылатых слоў падзяляюцца на празаічныя, паэтычныя і драматычныя.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

1. Празаічныя творы размяжоўваюцца паводле прыналежнасці да пэўнага жанру.

1.1. Раман, напр.: *мая другая (лепшая) палавіна* < англ. *my better half* (Ф. Сідней, "Arcadia", 1590); *ваяваць (змагацца) з ветракамі* або *бітва (змаганне) з ветракамі* < ісп. *molinos de viento acometer* (М. дэ Сервантэс, "Don Quijote", 1605 – 1615); *блакітная кветка* < ням. *blaue Blume* (Наваліс, "Heinrich von Ofterdingen", 1802); *грамадская думка* < фр. *opinion publique* (Ж.-Ж. Русо, "Julie, ou la Nouvelle Héloïse", 1761) і інш.

1.2. Аповесць, напр.: *хлопчык для біцця* < англ. *whipping-boy* (М. Твэн, "The Prince and the Pauper", 1882) і інш.

1.3. Навела, напр.: *хадзячая энцыклапедыя* < ням. *ein wandelndes Konversations-Lexikon* (Э.Т.А. Гофман, "Die Brautwahl", 1819) і інш.

1.4. Літаратурная казка, напр.: *закон джунгляў* < англ. *the jungle law* або *the law of the jungle* (Дж.Р. Кіплінг, "The Second Jungle Book", 1895); *<А> кароль <жа> голы!* < дац. *Men han har jo ikke nogat paa* (Г.Х. Андэрсен, "Keiserens nye Klæder", 1837) і інш.

1.5. Літаратурныя выслоўі, напр.: *Старыя таму так любяць даваць добрыя парады, што яны ўжо не могуць падаваць дрэнныя прыклады* < фр. *Les vieillards aiment à donner de bons préceptes pour se consoler de n'être plus en état de donner de mauvais exemples* (Ф. дэ Ларашфуко, "Réflexions ou sentences et maximes morales", 1665) і інш.

2. Паэтычныя творы таксама размяжоўваюцца паводле жанравых разнавіднасцей.

2.1. Паэма, напр.: *На людзей паглядзець і сябе паказаць* < лац. *Spéctatúm veniúnt, veniúnt specténtur ut ípsae* (Авідзій, "Ars amandi", I, 99); *каханне з першага погляду* < англ. *love at first sight* (К. Марла, "Hero and Leander", 1598); *Быў... і няма яго!* < іт. *Fu... e non è!* (Д. Аліг'еры, "Divina Commedia", 1307 – 1321); *Пакіньце ўсякую надзею* < іт. *Lasciate ogni speranza* (Д. Аліг'еры, "Divina Commedia", 1307 – 1321); *за дрэвамі не бачыць лесу* < ням. *den Wald vor lauter Bäumen nicht sehen* (К.М. Віланд, "Musarion", 1768); *Тое, што добра разумееш, ясна і выкажаш <, і словы для гэтага лёгка знойдуцца>* < фр. *Ce que l'on conçoit bien s'énonce clairement, Et les mots pour le dire arrivent aisément* (Н. Буало, "L'Art poétique", 1674) і інш.

2.2. Літаратурная байка, напр.: *Шукаю чалавека* < лац. *Hominem quaero* (Федр, "Эсоповы басни", III, 19); *Мацнейшы заўсёды правы* < фр. *La raison du plus fort est toujours la meilleure* (Ж. дэ Лафантэн, "Le Loup et l'Agneau" з яго першай кнігі "Fables", 1668) і інш.

2.3. Ода, напр.: *іскра божая* < ням. *Götterfunken* (Ф. Шылер, "An die Freude", 1786) і інш.

2.4. Верш, напр.: *белая варона* < лац. *alba avis (corvus)* (Ювенал, "Satirae", VII, 202); *голая ісціна (праўда)* < лац. *nuda veritas* (Гарацый, "Carmina", I, 24, 7); *сто тысяч чаму* < англ. *seven million Whys* (Дж.Р. Кіплінг, "Six Honest Serving

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Men” з яго казкі “The Elephant’s Child” з кнігі “Just So Stories”, 1902); *Чалавек заўсёды спадзяваецца на лепшае* < ням. *Der Mensch hofft immer Verbesserung* (Ф. Шылер, “Die Hoffnung”, 1797) і інш.

2.5. Эпіграма, напр.: *цяга да творчасці* < ням. *Lust zu fabulieren* (І.В. Гётэ, аўтабіяграфічная эпіграма) і інш.

3. Драматычныя.

3.1. Трагедыя, напр.: *Праз церні да зорак* < лац. *Per aspera (ardua) ad astra* (Сенека, “Hercules furens”, 441); *<Каня! Каня!> Паўцарства за каня!* < англ. *A horse! a horse! my kingdom for a horse!* (У Шэкспір, “King Richard III”, 1593); *бліскаць сваёй адсутнасцю* < фр. *briller par son absence* (М.-Ж. Шэнье, “Tibère”, 1805) і інш.

3.2. Драма (адзін з асноўных жанраў драмы як літаратурнага роду разам з камедыяй і трагедыяй), напр.: *Усё або нічога* < англ. *all or nothing* (Г. Ібсен, “Brand”, 1866); *Маўр зрабіў сваю справу, маўр можа ісці* < ням. *Der Mohr hat seine Schuldigkeit getan, der Mohr kann gehen* (Ф. Шылер, “Die Verschwörung des Fiesco zu Genua”, 1783); *Шукайце жанчыну!* < фр. *Cherchez la femme!* (А. Дзюма-бацька, “Les Mohicans de Paris”, 1864) і інш.

3.3. Камедыя, напр.: *абяцаць залатыя горы* < лац. *montes auri pollicēri* (Тэрэнцый, “Phormio”, 67–68); *за прыгожыя вочы* < фр. *pour les beaux yeux* (Ж.-Б. Мальер, “Les Précieuses ridicules”, 1660) і інш.

3.4. Фарс (малы камічны жанр заходнееўрапейскага сярэдневечнага тэатра, дасягнуў найвышэйшага росквіту ў XIV–XVI стст. У Францыі), напр.: *Вернемся да нашых баранаў!* < фр. *Revenons (retournons) à nos moutons!* (ананімны французскі фарс “Maistre Pierre Patelin”, каля 1470) і інш.

Трэба адзначыць, што ў існуючых лексікаграфічных апісаннях крылатых слоў у беларускай мове [14], [18], [19] прадстаўлены далёка не ўсе запазычаныя крылатыя выразы і афарызмы з іншамоўных літаратурна-мастацкіх крыніц.

Так, у выніку даследавання ўстаноўлена, што ў сучаснай беларускай мове ўжываецца не менш за 270 крылатых выразаў і афарызмаў з іншамоўных (англамоўных, нямецкамоўных, франкамоўных) літаратурна-мастацкіх крыніц XVII–XX стст. На наш погляд, усе крылатыя словы з еўрапейскіх літаратурна-мастацкіх твораў мэтазгодна аб’яднаць у межах аднаго даведніка. Слоўнікавы артыкул у такім даведніку, зыходзячы з ужо прынятай структуры і формы апісання крылатых слоў у існуючых слоўніках [14], [18], [19], можа выглядаць наступным чынам (на прыкладзе крылатых выразаў і афарызмаў з англамоўных літаратурна-мастацкіх крыніц).

1. Што яму Гекуба <, што ён Гекубе?> <= англ. *What’s Hecuba to him, or he to Hecuba?* – выраз з трагедыі “The Tragical Historie of Hamlet, Prince of Denmarke” (“Трагічная гісторыя Гамлета, прынца Дацкага”, 1603) англійскага паэта і драматурга Уільяма Шэкспіра (1564–1616). □ ***Гаворыцца, калі каму-н. няма справы да каго-н. ці да чаго-н.*** 🕮 Але што нам Гекуба? Што нам далёкая Індыя? У Мінску ўсё пакуль абышлося некалькімі параненымі. Як ка-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

жуць, вядзецца следства. («Наша Ніва»). Аксана ніколі не лезла ў навуковыя справы. Павыкладаўшы гісторыю ў школе, “наеўшыся” настаўніцкага жыцця, скончыла курсы візажыстаў і цяпер някепска пачуваецца ў прыватным салоне прыгажосці. Што ёй Гекуба, дакладней, Вінцэсь Рашчынскі? («Дзеяслоў»). *»Хто ён Гекубе? Хто яму Гекуба?» А вось… («Дзеяслоў»). *Руск.:* Что ему Гекуба, что он Гекубе?

Вылучэнне крылатых слоў з літаратурна-мастацкіх крыніц у асобны прадмет лексікаграфічнага апісання набывае асаблівую значнасць у сувязі з пашырэннем у сучаснай камунікатыўна-дыскурсіўнай прасторы жартоўных і парадыйных пераўтварэнняў крылатых выразаў і афарызмаў [10], паколькі дакладнае веданне тэкставай крыніцы перафразаванага крылатага выразу ці афарызма дазваляе адэкватна (правільна) зразумець яго сэнс у тых выпадках, калі жарт або пародыя скіраваны на змест аўтарскага першакантэксту крылатай адзінкі.

Літаратура

1. Венідзіктаў, С. В. Іншамоўныя крылатыя выразы ў сучаснай беларускай мове / С. В. Венідзіктаў // Studia sławistyczne. – 2003. – Т. 4. – S. 121–130.

2. Венідзіктаў, С. В. Рускамоўныя запазычанні крылатых слоў у сучаснай беларускай мове / С. В. Венідзіктаў, Я. Я. Іваноў // Dziedzictwo przeszłości związków językowych, literackich i kulturowych polsko-bałto-wschodniosłowiańskich. – Białystok, 2002. – T. VIII. – S. 210–217.

3. Иванов, Е. Е. Белорусская паремиология и афористика в общеевропейском контексте (актуальные проблемы изучения) / Е. Е. Иванов // XV Міжнародны з’езд славістаў = XV Международный съезд славистов = XV International Congress of Slavists, Мінск, 20–27 жніўня 2013 г. : тэзісы : у 2 т. – Мінск : Беларуская навука, 2013. – Т. 1. – С. 322–333.

4. Иванов, Е. Е. Белорусская паремиология и афористика в общеевропейском контексте (актуальные проблемы изучения) / Е. Е. Иванов // Nationales und Internationales in der slawischen Praseologie = Национальное и интернациональное в славянской фразеологии / Hrsg. H. Walter, V. M. Mokienko. – Greifswald : E. M. A.-Universität, 2013. – S. 111–116.

5. Иванов, Е. Е. О реккурентных прототипах крылатых фраз / Е. Е. Иванов // Славянская фразеология в ареальном, историческом и этнокультурном аспектах : материалы III Междунар. науч. конф., Гомель, 7–8 октября 2003 г. / Гомельский гос. ун-т им. Ф. Скорины [и др.] ; редкол.: В. И. Коваль (отв. ред.) [и др.]. – Гомель, 2003. – С. 74–78.

6. Иванов, Е. Е. Языковая природа крылатых слов / Я. Я. Іваноў // Праблемы беларускага літаратуразнаўства (да 85-годдзя з дня нараджэння А. А. Куляшова) : зб. навук. арт. / рэдкал.: Я. І. Клімуць (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МНТ, 2000. – С. 303–312.

7. Іванова, С. Ф. Запазычаныя крылатыя выразы ў сучаснай беларускай мове / С. Ф. Іванова, А. Дз. Цеплякова // Фразеология германских, романских и славянских языков : = Phraseology of Germanic, Romanic and Slavic Languages = Phraséology qermnique, romane et slave : сб. науч. ст. / под ред. Е. Е. Иванова. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2009. – Вып. 1. – С. 98–112.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

8. Іванова, С. Ф. Крылатыя словы са старажытнагрэчаскіх крыніц у сучаснай беларускай літаратурнай мове / С. Ф. Іванова, А. Дз. Цеплякова // Славянская фразеология и паремиология в XXI веке : сб. науч. ст. / под ред. Е. Е. Иванова, В. М. Мокиенко. – Минск : Изд. Зм. Колас, 2010. – С. 284–292.

9. Іванова, С. Ф. Лацінскія запазычанні крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове (колькасны склад, формы ўжывання і крыніцы паходжання) / С. Ф. Іванова, А. Дз. Цеплякова // Веснік Мазырскага дзярж. пед. ун-та імя І. П. Шамякіна. – 2010. – № 1 (26). – С. 88–93.

10. Іванова, С. Ф. Парадыйныя, іранічныя і жартоўныя трансфармацыі крылатых выразаў (да складання слоўніка беларускіх антыпрыказак) / С. Ф. Іванова, Я. Я. Іваноў, В. А. Шпакоўская // Даследаванні па германскай і славянскай філалогіі = Acta Germano-Slavica : зб. навук. арт. / пад рэд. Я. Я. Іванова. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2011. – Вып. 4. – С. 52–61.

11. Іванова, С. Ф. Старажытнагрэчаскія запазычанні крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове (колькасны склад, формы ўжывання і крыніцы паходжання) / С. Ф. Іванова, А. Дз. Цеплякова // Веснік Полацкага дзярж. ун-та. Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2010. – № 7. – С. 176–179.

12. Іваноў, Я. Я. Афарыстычнае выказванне як моўная мадэль крылатых слоў / Я. Я. Іваноў // Філалогічні студії : наук. вісник Криворізького держ. пед. ун-ту. – 2017. – Вип. 16. – С. 114–121.

13. Іваноў, Я. Я. Афарыстычныя адзінкі ў беларускай мове / Я. Я. Іваноў. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2017. – 208 с.

14. Іваноў, Я. Я. Крылатыя афарызмы ў беларускай мове: з іншамоўных літаратурных і фальклорных крыніц VIII ст. да н. э. – XX ст. : тлумачальны слоўнік / Я. Я. Іваноў. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2011. – 164 с.

15. Іваноў, Я. Я. Крылатыя словы / Я. Я. Іваноў // Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. – Мінск, 2005. – Т. 1. – С. 729–730.

16. Іваноў, Я. Я. Літаратурныя крыніцы фразеалагічных адзінак, запазычаных з нямецкай мовы ў беларускую мову (па-за межамі этымалагічнага слоўніка фразеалагізмаў / Я. Я Іваноў, А. Дз. Цеплякова // Немецкий язык – лингводидактическое обеспечение и методика преподавания : сб. науч. ст., посвящ. памяти С. А. Носкова (1943–2018) / под ред. Е. Е. Иванова. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2019. – С. 82–87.

17. Іваноў, Я. Я. Старажытнагрэчаскія крыніцы некаторых крылатых афарызмаў / Я. Я. Іваноў // Нацыянальная мова і нацыянальная культура : аспекты ўзаемадзеяння : зб. навук. арт. / рэдкал.: Д. В. Дзятко (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2013. – С. 225–228.

18. Крылатыя выразы ў беларускай мове: тлумачальны слоўнік. Ч. 1: З іншамоўных (еўрапейскіх і амерыканскіх) крыніц XII–XX стст. / С. В. Венідзіктаў, І. Л. Даніленка, С. Ф. Іванова, Я. Я. Іваноў ; пад рэд. Я. Я. Іванова. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2004. – 136 с.

19. Крылатыя выразы ў беларускай мове : тлумачальны слоўнік. Ч. 2 : З рускамоўных літаратурных і фальклорных крыніц XII–XX стст. / С. В. Венідзіктаў, І. Л. Даніленка, С. Ф. Іванова, Я. Я. Іваноў, В. В. Чэх. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2006. – 208 с.

20. Крылатыя словы // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск : БелЭн, 1999. – Т. 8. – С. 507.

21. Лепешаў, І. Я. Крылатыя словы / І. Я. Лепешаў // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск : БелСЭ, 1986. – Т. 3. – С. 137.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

22. Лепешаў, І. Я. Крылатыя словы і фразеалагізмы / І. Я. Лепешаў // Роднае слова. – 1992. – № 9. – С. 38–41.

23. Міхневіч, А. Я. Крылатыя словы / А. Я. Міхневіч // Беларуская мова : энцыклапедыя. – Мінск : БелЭн, 1994. – С. 273–274.

24. Слоўнік беларускіх прыказак, прымавак і крылатых выразаў : лінгвакраіназнаўчы дапаможнік / С. Ф. Іванова, Я. Я. Іваноў. – Мінск : БФС, 1997. – 262 с.

25. Теплякова, А. Д. Иноязычные заимствования крылатых слов в белорусском и немецком языках / А. Д. Теплякова // Язык, культура, общество : материалы VI Междунар. науч. конф., Москва, 22–25 сентября 2011 г. / науч. ред. Э. Ф. Володарская. – М. : МИИЯ, 2011. – С. 125–126.

26. Теплякова, А. Д. Источники крылатых выражений в белорусском языке / А. Д. Теплякова // Фразеология и языковая динамика : сб. науч. тр., посвящ. 55-летию проф. Х. Вальтера / науч. ред. В. М. Мокиенко, А. В. Савченко. – Greifswald : Ernst-Moritz-Arndt Universität; СПб : СПбГУ, 2011. – С. 67–69.

27. Цеплякова, А. Дз. Англамоўныя запазычанні крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове (колькасны склад і крыніцы паходжання) / А. Дз. Цеплякова // Веснік Мазырскага дзярж. пед. ун-та імя І. П. Шамякіна. – 2009. – № 2 (23). – С. 162–166.

28. Цеплякова, А. Дз. Нямецкамоўныя запазычанні крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове (колькасны склад і крыніцы паходжання) / А. Дз. Цеплякова // Веснік МДУ імя А. А. Куляшова. – 2009. – № 1 (32). – С. 137–143.

29. Цеплякова, А. Дз. Франкамоўныя запазычанні крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове (колькасны склад і крыніцы паходжання) / А. Дз. Цеплякова // Веснік Брэсткага дзярж. ун-та імя А. С. Пушкіна. Сер. філал. навук. – 2009. – № 2 (12). – С. 109–116.

30. Цеплякова, А. Дз. Іншамоўныя запазычанні крылатых слоў у сучаснай беларускай мове / А. Дз. Цеплякова // Теоретические и практические предпосылки подготовки полилингвальных специалистов в вузе : материалы I Междунар. науч.-практ. онлайн-семинара (вебинара), Могилев, 26 марта 2015 г. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2015. – С. 74–77.

31. Цеплякова, А. Дз. Крыніцы паходжання лацінскіх запазычанняў крылатых слоў у сучаснай беларускай мове / А. Дз. Цеплякова // Даследаванні па германа-славянскай філалогіі = Acta Germano-Slavica : зб. навук. арт. / пад рэд. Я. Я. Іванова. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2011. – Вып. 4. – С. 96–101.

32. Цеплякова, А. Дз. Структура, семантыка і функцыі запазычаных крылатых слоў у беларускай мове / А. Дз. Цеплякова // Славянская фразеология в ареальном, историческом и этнокультурном аспектах : материалы V Междунар. науч. конф., 22–23 октября 2007 г. / редкол.: В. И. Коваль (отв. ред.) [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф Скорины, 2007. – С. 236–240.

33. Янкоўскі, Ф. Крылатыя словы і афарызмы (з беларускіх літаратурных крыніц) / Ф. Янкоўскі. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1960. – 135 с.

34. Ivanov, E. Aphorism as a Unit of Language and Speech / Eugene Ivanov // EUROPHRAS 2016 : Word Combinations in the Linguistic System and Language Use: Theoretical, Methodological and Integrated Approaches, Trier, Germany, August 1–3, 2016 : Abstracts / University of Trier. – Trier, 2016. – S. 42.

35. Proverbia et dicta : шасцімоўны слоўнік прыказак, прымавак і крылатых слоў / Н. А. Ганчарова [і інш.] ; пад рэд. Н. А. Ганчаровай. – Мінск : Універсітэцкае, 1993. – 255 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова